

20-годдзе для каталіцкага выдання ў нашым кантэксце – вельмі знач- ная дата. “Слова Жыцця” было заснавана ў гады рэлігійнага рэнесансу. Тады патрэба ў інфармацыі пра жыццё Касцёла была высокай, але і праз гады калектыў не толькі здолеў утрымаць свайго чытача, але і заваяваць аўтарытэт сярод іншых каталіцкіх мас-медый. Важна не спыняцца на дасягнутым, бо “motus est vita”, што з латыні значыць “рух – гэта жыццё”. Калі правесці аналогію з роляй газеты ў сучасным грамадстве, можна дадаць: рух аўдыторыі да Бога – ёсць сэнс жыцця любога каталіцкага СМІ. А ў XXI стагоддзі гэта, магчыма, яшчэ больш актуальна, чым два дзесяцігоддзі таму. Папа Францішак лічыць, што каталіцкія СМІ маюць вельмі складаную місію – садзейнічаць камунікацыі паміж людзьмі і пашыраць культуру сустрэчы. Вядома, што гэта можа адбывацца толькі пры наяўнасці шчырасці і жадання гаварыць праўду, пры адсутнасці кан’юнктурнасці, замкнёнасці, страху, цэнзуры і стэрэатыпаў, якія падрываюць здольнасць да сапраўдных евангельскіх зносін чалавека з чалавекам, чалавека з Богам... Застаецца толькі пажадаць Вам, дарагія супрацоўнікі “Слова Жыцця”, быць мужнымі, каб гаварыць сумленна і свабодна, адкрытымі, каб слухаць і чуць, несучы слова Евангелля – слова хрысціянскага жыцця, само жыццё! †

Паважаныя калегі! Шчыра віншуем Вас з нагоды 20-годдзя з дня заснавання газеты “Слова Жыцця”. Усяму калектыву рэдакцыі, шматлікім пазаштатным аўтарам выдання жадаем моцнага здароўя і творчага плёну. Няхай Вас ніколі не пакідае перакананне, што распачатая папярэднікамі справа моцна патрэбна сучаснікам дзеля хвалы Божай, дзеля перамогі дабра над злом, дзеля збаўлення чалавека. Няхай добры Пан дапамагае Вам знаходзіць годныя ўвагі тэмы, цікавых людзей, якія гатовы сведчыць аб прысутнасці Бога ў нашым жыцці. Яшчэ раз са святам!


КАТОЛІК
ГОМЕЛЬ


Выдавецтва «Pro Christo»


Выдавецтва
Гродзенскай дыяцэзіі


ДОБРАЯ ВЕСТКА У ПЯВАЙМ ДОМЕ!
Каталіцкі ВЕСНІК
ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАЙ ДЫЯЦЭЗІІ


Catholic.by


РАДЫЁ МАРЫЯ
WWW.RADIOMARIA.BY


Маленькі рыцар
Беззаганнай


Выдавецтва
Пінскай дыяцэзіі



Хай!